« »

30 лістапада ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (г. Мінск) адбыўся фінал Рэспубліканскага фестывалю творчасці замежных студэнтаў "F.-ART.by", які сёлета праходзіў пад дэвізам "Дыялог моладзі свету – у свеце творчасці і стварэння", і быў прысвечаны Году міру і стварэння. Арганізатары фестывалю: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Уладальнікам дыплома ІІ ступені ў намінацыі "GAUDEAMUS IGITUR" стаў народны хор "Кантылена" (кіраўнік Т.В. Жукава) ВДУ імя П.М. Машэрава.

« »

8 і 9 снежня прайшоў ІІ Адкрыты гарадскі фестываль ваенна-патрыятычнай песні "Праз гады – Памятайце!". У фестывалі прынялі ўдзел салісты студыі эстраднай песні "Шанц" (кіраўнік А.А. Кушчына) ВДУ імя П.М. Машэрава. Лаўрэатам ІІ ступені стала салістка студыі эстраднай песні "Шанц", студэнтка І курса педагагічнага факультэта Ангеліна Васілеўская.

« »

Пераможцамі рэспубліканскай выставы "У колеры падарожжа – уражанні і ўяўленні", што праходзіла ў рамках Рэспубліканскага фестывалю творчасці замежных студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі "F.–ART.by" ў намінацыі "Візуальны сэт" сталі студэнты мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава: Лі Шуай, Ван Сінь, Сюй Шу (кіраўнік С.В. Мядзвецкі); Цянь Яо Юй, Ван Юй Фань (кіраўнік А.В. Мядзвецкі), Ду Цяофэй (кіраўнік А.Д. Кастагрыз), Бао Узінь (кіраўнік Д.С. Сянько). Арганізатарамі праекта сталі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

« »

10 студзеня на чыгуначнай станцыі Багушэўская Сенненскага раёна адкрыта скульптура "Рэха кахання". Ініцыятыва жыхароў гарпасёлка ўвасоблена скульптарамі Ігарам Голубевым і Сяргеем Сотнікавым дзякуючы спонсарскай падтрымцы сям'і Праскуравых. Мерапрыемства прымеркавана да 200-годдзя з дня нараджэння Дзмітрыя Багушэўскага, памешчыка з Санкт-Пецярбурга і палкоўніка царскай арміі ў адстаўцы, на землях якога і ўзнік гарпасёлак Багушэўск.

« »

4-га студзеня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта ВДУ адкрылася выстава "Адраджэнне і трансфармацыя", на якой былі прадстаўлены графічныя работы магістранта з Кітая Се Пэна (куратар М. Цыбульскі).

У экспазіцыі тэматычныя ілюстрацыі, ілюстрацыі да дзіцячых твораў і іншыя графічныя фантазіі маладога мастака. Усе работы былі створаны ў Віцебску на працягу паўгода. Суарганізатарам выставы стаў Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва.

« »

У экспазіцыйнай прасторы ВДМУ адбылося адкрыццё выставачнага праекта “Афрыканская гісторыя”(куратар выставы А.Д. Лаліні). Выстава аб’ядноўвае работы беларускай мастачкі Марыны Максімовіч і італьянскага мастака Паола Ладамада.

« »

3 лістапада 2023 г. у Гомелі ў Палацы Румянцавых і Паскевічаў пачала экспанавацца выстава Уладзіміра Пракапцова “Пад знакам бясконцасці”. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 40 работ. Творчасць Уладзіміра Пракапцова характарызуецца арыгінальным вядомым стылем, глыбокім філасофскім зместам, любоўю да роднай зямлі.

« »

Выстава віцебскага жывапісца, кандыдата педагагічных навук, прафесара кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Рыгора Сяргеевіча Фядзькова адкрылася 22 лютага ў Мастацкім музеі. Экспазіцыю выстаўкі склалі жывапісныя эцюды Віцебшчыны, выкананыя на пленэры вясной, летам і восенню 2022 года.

« »

2 сакавіка дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва Д.С. Сянько, выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва Ю.А. Багданава і старшы выкладчык кафедры дызайну Т.У. Гаралевіч прынялі ўдзел у рабоце журы рэгіянальнага этапу міжнароднага конкурсу навукова-тэхнічных і мастацкіх праектаў па касманаўтыцы “Зорная эстафета”. Было разгледжана больш за 40 творчых работ, прысвечаных космасу і знакамітым касманаўтам. Адбылася таксама абарона твораў, у час якой юныя мастакі з натхненнем расказалі пра свае карціны, тэхніку выканання, пра тое, што іх натхніла на стварэнне работ. У выніку конкурсу ў мастацкай секцыі было аб‘яўлена 5 пераможцаў, якім былі ўручаны дыпломы і сертыфікаты на бясплатнае наведванне абсерваторыі ў ВДУ імя П.М. Машэрава.